УДК 821.161.3

***А.С. Кавалюк***

*канд. філал. навук, дац., дац. каф. беларускага літаратуразнаўства*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# ДУХОЎНА-АКСІЯЛАГІЧНАЯ ПРАСТОРА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ Ў ПРОЗЕ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА ВАЕННАГА ЧАСУ

*У артыкуле асэнсоўваецца мастацкае ўвасабленне нацыянальнага характару беларусаў у прозе Кузьмы Чорнага ваеннага часу, аналізуецца духоўны свет герояў, носьбітаў аўтарскага ідэалу і антыідэалу.*

Класік беларускай літаратуры Кузьма Чорны ў гады Вялікай Айчыннай вайны здзейсніў сапраўдны мастакоўскі подзвіг: цяжка хворы, паўгалодны, перагружаны тэрміновай працай «на хлеб надзённы», у неспрыяльных для творчасці ўмовах напісаў каля паўсотні публіцыстычных артыкулаў, выступленняў, фельетонаў (яны склалі зборнік «Кат у белай манішцы», 1942), падрыхтаваў да друку зборнік апавяданняў «Вялікае сэрца», напісаў тры раманы, зрабіў накіды для новых эпічных твораў. Ён пакінуў кароткія, але надзвычай ёмістыя ў філасофскім сэнсе дзённікавыя запісы, дзе на поўны голас гаварыў пра трагедыю, якая напаткала беларусаў у савецкі час. Разважанні пісьменніка сведчаць, што не толькі хвароба цялесная, але і крыўда за лёс інтэлегенцыі прыспешвалі адыход з жыцця ў росквіце творчых сіл аднаго з лепшых мастакоў слова.

Творчасць Кузьмы Чорнага даследчыкі лічаць унікальнай у нацыянальнай літаратуры з’явай. На думку М. Тычыны, яго раманы ваеннага часу былі выключнымі у гісторыі сусветнай літаратуры, таму што «у мастацка-філасофскім асэнсаванні эпохі беларускі пісьменнік апярэджваў многія вядомыя творы, такія, як раманы «Чума» Альбера Камю і «Доктар Фаустус» Томаса Мана, дзе ўздымаліся фундаментальныя праблемы чалавечага існавання» [4, с. 360]. Таму невыпадкова, што якраз раманы «Пошукі будучыні», «Вялікі дзень», «Млечны шлях» неаднойчы станавіліся прадметам літаратураўнаўчага даследавання. М. Мішчанчук небеспадстаўна адзначыў, што названыя раманы непадобныя да раней напісаных твораў: «сацыяльныя праблемы адышлі на другі план, а на першы вылучыліся агульначалавечыя. <…> Арэнай дзеяння становіцца Зямля пад Млечным Шляхам, а героямі – людзі і нелюдзі, гуманісты і каты, ахвяры і злодзеі. Вобразы прыроды, людзей, дэталі побыту ў раманнай прозе пісьменніка як бы перарастаюць самі сябе, становяцца сімваламі агульнафіласофскіх катэгорый, а змест гэтай прозы набывае агульначалавечае значэнне» [2, с. 107]. Літаратуразнаўца звярнуў увагу на тое, што ў творах Чорнага ваенных гадоў на ўсю моц загучалі гуманістычныя ідэі, занядбаныя ў гады сталіншчыны. М. Мішчанчук акцэнтаваў увагу на занепакоенасці пісьменніка духоўным падзеннем чалавецтва. З гэтай прычыны, на яго думку, душа Кузьмы Чорнага ўсё больш поўнілася пачуццём вялікага замілавання да простага беларускага чалавека.

Героі Кузьмы Чорнага – *сумлічане* ў рамане «Пошукі будучыні», «ціхія *сумленнікі»* ў рамане «Вялікі дзень», найменне якіх даследчыкі звязваюць з беларускім словам *«сумленне»*. Ці не сумленнем нацыі са старонак «Пошукаў будучыні» паўстаюць Юрась Нявада, яго дачка Волечка, Кастусь Лукашэвіч, Сымон Ракуцька? Іх надзяліў пісьменнік лепшымі рысамі нацыянальнага характару, праз іх вобразы апаэтызаваў хараство беларускай душы, якая, па меркаванні М. Тычыны [4, с. 362], у гады вайны ўбачылася мастаку з асаблівай вастрынёй і болем.

Знаёмства з літаратуразнаўчымі працамі паказала, што даследчыкі звярталі ўвагу на прыярытэтную ролю духоўных каштоўнасцей у прозе Кузьмы Чорнага ваеннага ча-

су, але праблема аксіялагічнай прасторы нацыянальнага характару асэнсавана імі не дастаткова. Тэарэтычнае вывучэнне праблемы выявіла, што пад тэрмінам «нацыянальны характар» разумеюць сукупнасць найбольш устойлівых псіхалагічных якасцей, сфарміраваных у прадстаўнікоў нацыі ў пэўных прыродных, гістарычных, эканамічных і сацыяльна-культурных умовах яе развіцця. Паняцце «нацыянальны характар» выкарыстоўваюць для тлумачэння і характарыстыкі псіхалогіі асобных народаў, іх стылю і вобразу жыцця, нораваў, звычаяў, паводзін і г.д. З аднаго боку, нацыянальны характар разглядаецца як закладзены генетычна, які перадаецца з пакалення ў пакаленне. З другога боку, наадварот, – як феномен, абумоўлены сацыяльна-гістарычнымі і культурнымі ўмовамі развіцця нацыі. Першапачаткова даследаванні нацыянальнага характару абмяжоўваліся назіраннем і этнаграфічным апісаннем звычаяў, традыцый, побыту, ладу жыцця народаў. Пазней этнаграфічныя метады збору інфармацыі былі дапоўнены псіхааналізам як метадам яе асноўнай інтэрпрэтацыі, а таксама метадамі аналізу дакументаў (мастацкіх твораў, публіцыстыкі, біяграфічных апісанняў, афіцыйных матэрыялаў і г.д.) [3]. На падставе высноў культуролагаў мы паспрабуем правесці аналіз твораў Кузьмы Чорнага.

Традыцыйна пры выяўленні рысаў нацыянальнага характару беларусаў гаворка ідзе пра іх гасціннасць, працавітасць, жыццястойкасць, здольнасць да суперажывання і дапамогі, уменне весці гаспадарку, гаспадарыць на зямлі і адчуваць простае шчасце людское. Усе гэтыя рысы нацыянальнага характару знайшлі выяўленне ў творах Кузьмы Чорнага, асабліва апошняга перыяду творчасці. Найбольш паказальнымі ў гэтым плане з'яўляюцца першы ваенны раман «Пошукі будучыні» і апошняя па часе напісання, як сведчыць дзённік, аповесць – «Скіп'ёўскі лес». З усёй мастацкай выразнасцю ў іх створаны нацыянальныя вобразы-тыпы.

У шаснаццацігадовым узросце Кастусь Лукашэвіч, герой рамана «Пошукі будучыні», застаўся сіратой. Жыццё зрабіла яго раней пары дарослым і самастойным. Кузьма Чорны паказаў, як з юнака вырас працавіты гаспадар. Праца гаіла раны ягонага сэрца, *«ураўнаважвала яго душу <...> Льга думаць, што ён, у гэты час свае маладосці, вельмі мала закідаў думкі далёка наперад. Вельмі можа быць, што тут і пачыналася яго шчасце: прынамсі цяжкая паняверка не гняла яго душы і не сеяла ў ёй смутку. Чалавек меў радасць ад усяго таго, што рабіў кожны дзень. Так гартавалася і яго дужасць»* [5, с. 61–62].

Упершыню аглядаючы пуню невядомага яму Нявады, Кастусь пераконваецца, што *«добры гаспадар быў Нявада! Бічы ў цапах былі важкія і зручныя. Гужы шчыльныя, і завязкі з добрага сурамцу»* [5, с. 43]. Заўважым, што такую ацэнку Нявадавай гаспадарлівасці дае юнак, якому толькі раз у жыцці даводзілася сеяць поле, калі бацька хварэў. Тым самым Кузьма Чорны пераконвае, што дзіця, якое нараджалася і выхоўвалася ў сялянскай сям'і, убірала ў сябе багаты духоўны вопыт, стэрэатып паводзін, звычаі, норавы, якія панавалі ў гэтай сям'і і вёсцы. І нават застаўшыся без апекі дарослых, яно здольна было выжыць, пракарміцца (калі трэба – накарміць іншых), нягледзячы на сваё малалецтва, умела весці гаспадарку. Не сталі жабракамі, застаўшыся сіротамі, ні Кастусь Лукашэвіч, ні Волечка Нявада. Ваеннае ліхалецце прымусіла іх пакаленне *«змалку прывучацца да плуга і касы, да пілы і сякеры, да гэбля і долата, да молата і кавадла. <...> Сталася так, што дзесяцігадовыя дзяўчаткі жалі жыта, дванаццацігадовыя хлапчукі аралі як мае быць, а пятнаццацігадовыя самі вялі гаспадарку, кармілі сем'і працай сваіх рук, ведалі, дзе, што і як сеяць, умелі зрабіць новы панарад і драбіны і давалі слушныя заўвагі кавалю, калі той не так як трэба нацягваў шыну на кола. Шаснаццацігадовыя хлопцы хадзілі па пілоўцы, а сямнаццацігадовыя пачыналі пераймаць цяслярства»* [5, с. 27].

Кастусь па-гаспадарску даглядае коней, малоціць жыта, засявае поле, нарыхтоўвае дровы на зіму. Яго жыццёвы вопыт ужо ўтрымлівае веды пра тое, як выгадней прадаць старога каня ці спілаваць дрэва, каб ніхто не пачуў звону. Вярнуўшыся з палону, гаспадарскае вока старога Нявады заўважае новую браму *«на чэсаных слупах і з габляваных брускоў»*, сцірту дошак, чэсанае бярвенне, тратуарчык з аполкаў уздоўж сцяны. Гэтымі мастацкімі дэталямі дапаўняецца вобраз маладога, але дбайнага гаспадара Кастуся Лукашэвіча. Аўтар перадае настрой хлопца, калі ён скончыў такую *«важную работу»* – пасеяў жыта і калі *«як сявец ён вытрымаў экзамен як найлепш»*. А як па-даросламу адказвае Кастусь на прызнанне Волечкі, якая не можа пазнаць, калі будзе цяліцца карова: *«Дык вучыся пазнаваць, калі хочаш быць добрай гаспадыняй»* [5, с. 71].

У свае чатырнаццаць год Волечка і без таго была добрай гаспадыняй, *«займалася дробнай хатняй таўкатнёй, як самая руплівая з усіх жанчын на свеце»* [5, с. 37]. Непакоіцца, што ў хаце другі дзень чужыя людзі, а яна ім нічога нават перакусіць не дала. Адзінае, мабыць, што Нявадава дачка не ўмее ў свае чатырнаццаць год – гэта пячы хлеб. Як сапраўдная гаспадыня яна саромелася даваць няўдалы хлеб чужым людзям. Гэта і ёсць стэрэатып паводзінаў, які дзяўчына пераняла ад сваёй маці. Дзіцячая памяць занатавала, як маці старалася, каб як лепш накарміць бацьку, які выконваў цяжкую сялянскую працу. Па меркаванні Кузьмы Чорнага, дарослы жыццёвы вопыт замацоўваўся ў дзіцячых гульнях, а ўспаміны і інстынктыўныя адчуванні – тое, што дапамагала дзіцяці-сіраце не збіцца з жыццёвага тропу. *«Дзеці часта гуляюць у дарослых. Тут жа не было гульні, была самая бязлітасная неабходнасць, але Волеччын твар быў цяпер так падобен да твару зусім малой дзяўчынкі, якая пераймае ўчынкі свае маці!»* [5, с. 44]. Яшчэ да прыходу ў Нявадаву хату Кастуся дзяўчына сама ўпраўлялася з хатняй жывёлай. А яе не толькі трэба было карміць, карову – выдаіць, каня – запрэгчы ў воз ці плуг. Волечка арала поле, збіралася сеяць, гатова дапамагаць Кастусю малаціць жыта. Атрымліваецца, яна пераняла ўчынкі не толькі маці, але і бацькі.

Назіранні над тэкстам даюць падставы гаварыць, што Кузьма Чорны інтуітыўна адчуваў тое, да чаго прыйшлі ў сваіх аналітычных разважаннях вучоныя, ён паказаў, што нацыянальны характар перадаецца генетычна, у дадзенай сітуацыі праяўляецца на ўзроўні інстынкту самазахавання. Але калі ў прыродзе паводле закону самазахавання выжывае мацнейшы фізічна, то ў чалавечым асяроддзі важна быць духоўна мацнейшым, увабраць у сябе аксіялагічны вопыт папярэднікаў.

Волечка рана пасталела і стала сапраўднай гаспадыняй. І нас гэта зусім не здзіўляе. Як не здзіўляе і тое, што яна дала прытулак у сваёй хаце чужым людзям. Карані такога ранняга духоўнага станаўлення бачацца ў тым маральна-этычным кодэксе, які яна пераняла, як эстафету, ад сваіх бацькоў. Гэтым няпісаным кодэксам было закладзена разуменне і таго, што нельга чапаць чужога. І не важна, гэта тычыцца стога сена ці золата графа Паліводскага.

У старога Нявады *«не было прывычкі калі-небудзь думаць аб золаце і чапляцца душой за якое б там ні было багацце»* [5, с. 75]. Таму, знайшоўшы чужыя рэчы ў сваім куфары, ён спалохаўся іх, як агню, рашуча дапытвае дачку, дзе іх узялі. Калі даведаўся праўду, ад душы адлягло. У гэтым эпізодзе выяўляецца супрацьлегласць поглядаў Нявады і графа Паліводскага з Густавам Шрэдэрам, якія дваццаць гадоў не маглі забыць тое золата, змарнавалі праз яго жыццё. З другога боку, мы бачым Нявадаву гатоўнасць тлумачыць нават дарослай дачцэ, што такое «добра» і што такое «кепска». Чорны засяроджвае ўвагу на адказнасці беларусаў за выхаванне падрастаючага пакалення – яшчэ адной рысе нацыянальнага характару. Своеасаблівымі запаветамі нашчадкам гучаць словы Нявады: *«лепш грызці зямлю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце»* [5, с. 71]. Сістэму духоўных каштоўнасцей героя яскрава высвечваюць наступныя радкі: *«Пазбірайце вы, кажу, золата з усяго свету, зрабіце з яго трон,*

*пасадзіце на яго мяне кіраваць паўсветам, а каб увесь свет выхваляў мяне, дык я перад вамі буду прасіцца і маліцца: пусціце, калі ласка, дайце мне шчасце спаўзці з гэтага трона: я колькі год жыта не сеяў, кала нават не зачасаў, у кузні каня не каваў, у млыне мукі не малоў, раллі не нюхаў, ботаў не мазаў, капусты не сёрбаў, не наслухаўся ўволю, як пеўні спяваюць, як людзі па-людску гаворацьˮ* [5, с. 67].

Прыкладна такімі ж духоўна-аксіялагічнымі прыярытэтамі жыў і другі працаўнік на зямлі – Сымон Ракуцька. Ён, як і Нявада, бачыць сэнс жыцця ў сям'і, яе дабрабыце, забяспечанай будучыні дзяцей. Трагічны, пранізлівы і шчымлівы гэты вобраз. *«Чалавек гэты быў дзіўны. Так, як ніхто, ён пільнаваўся свайго гнязда, якое стала, хоць і маруднa, складаў, саломіна за саломінай»* [5, с. 77]. Кузьма Чорны такім чынам выявіў адну з вызначальных рыс ментальнасці беларуса – пільнавацца свайго гнязда, ратаваць яго ад каршуноў і наперакор усяму зноў віць. Больш таго, даводзіць пісьменнік праз вобраз Ракуцькі, беларус здольны адчуваць *«вялікую асалоду даводзіць да дасканаласці сваю новую дамоўку»* [5, с. 81].

Сымон Ракуцька ў імперыялістычную вайну зазнаў лёс бежанца, у адзін дзень пахаваў бацьку і сястру. Як адбылася рэвалюцыя, асеў на кавалку панскай зямлі. Ажаніўся. Дбаючы пра будучыню сваіх дзяцей, вёў сям'ю ў зманлівую Савецкую Беларусь, але перайсці мяжу здолеў толькі сам, жонка з дзецьмі засталіся на заходнебеларускай тэрыторыі. Сымон усе гады думаў пра іх, захоўваючы моцную бацькоўскую любоў і вернасць сваёй сям'і. Не менш кранае чытача і тое, як жонка Ракуцькі, застаўшыся з дзецьмі, сама пранесла праз гады каханне да мужа і навучыла дзяцей любіць бацьку. Ракуцька думаў ціха адсядзець на сваёй гаспадарцы і рыхтаваць будучыню сваім дзецям. Ён хацеў жыць па прынцыпу: не чапай нікога – і цябе не зачэпяць. Яго зачапілі – разбурылі яго шчасце: знявечылі маленства дзяцей, адабралі радасць у жонкі. Прагай помсты і расплаты гарэла яго сэрца. Ён ненавідзеў вайну, таму і ўзяў зброю ў рукі, каб бараніць будучыню.

Заслуга Кузьмы Чорнага ў тым, што ён стварыў пераканаўчы псіхалагічны партрэт беларуса з яго адметнымі нацыянальнымі рысамі – любоўю да радзімы, роднага гнязда, клопатам пра сям'ю, дзяцей. Беларус не заваёўнік, ён – абаронца. І няважна, што шлях Нявады-абаронцы скончыўся трагічна, але ён сумленна пражыў жыццё, пераняўшы ад продкаў і перадаўшы наступнікам-спаткаемцам існыя духоўна-аксіялагічныя арыенціры. Пісьменнік нібы наўмысна супрацьпастаўляе жыццёвыя ідэалы немцаў Шрэдэраў ці былога афіцэра расійскага войска графа Паліводскага.

Кузьма Чорны пераконваў, што нельга пабудаваць сваё шчасце на пакутах і горы іншых. Вайна і чужая зямля не прыносяць радасці захопнікам. Густаў Шрэдэр, ідучы на імперыялістычную вайну на Расію, быў поўны самых радасных надзей. Ён марыў пра шчаслівае будучае свайго сына. Горкае, поўнае адчаю пісьмо напісаў паранены салдат да родных, развітваючыся з жыццём: *«Густаў, сынок мой, і Анна, і Берта, і ўсе, каго я люблю і сохну па кім у апошнюю сваю часіну! Нам суджана больш ніколі не ўбачыцца. Я ўміраю ў чужых людзей у палоне. Ведайце навек, што я толькі і думаў, што пра вас і асабліва пра цябе, мой любы Густаў. Дзеля твае, Густаў, будучыні я ваяваў. Я прынёс бы табе спосаб на цудоўнае жыццё да самай твае старасці. З арандатараў чужой зямлі мы сталі б уласнікамі хоць і неаграмаднага, але маёнтка. Ты быў бы памешчыкам, а не арандатарам. Я ўжо ўсё быў зрабіў дзеля гэтага, але смерць, якая стаіць каля мяне, ужо вырывае з мяне душу і тваю будучыню. Божа, злітуйся! Але надзеі ўжо няма. Побач са смерцю стаяць каля мяне чужыя людзі. Бывайце навек. Вось месца, дзе я ўміраю. Ведайце і яго, усё ў жыцці можа быць, можа, калі каго з вас лёс занясе сюды, дзе будуць мае косці. Я ўміраю ў палоне... Грудзі мне муляе тое, што я здабыў табе, Густаў, на вайне і што не суджана ўзяць табе ў рукі. Канец мой падышоў»* [5, с. 54]. Гэты ліст паміраючага немца выразна вымалёўвае яго духоўна-аксіялагічныя прыяры-

тэты. Ён просіць літасці ў Бога, але не раскайваецца ў парушэнні запаведзей «Не забі» і «Не пажадай нічога, што ў бліжняга твайго». Густаў не памёр. Бог злітаваўся, і чужыя людзі, якіх ён хацеў заняволіць, выратавалі і паставілі яго на ногі. *«... Не пазнаць стала немца. <...> гэткі ў яго шчаслівы час настаў. <...> У яго радасць жыцця стаптала пад ногі смутак смерці»* [5, с. 55]. У гэты шчаслівы момант Шрэдэр піша чарговы ліст блізкім, які сведчыць, што лепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў абуджаюць у душы рабаўніка і марадзёра зусім іншыя пачуцці: *«Густаў, сынок мой, Анна, Берта! Шчасце і радасць, я жывы! Я іду дарагаю, і нада мной свеціць сонца. Усе людзі на зямлі добрыя і мілыя. Каб вы толькі ведалі, як аба мне дбалі і пра мяне клапаціліся тыя чужыя людзі, у хаце якіх я ляжаў! З'явіўся нейкі стары лекар і лячыў мяне, дай Божа яму здароўя. А нейкая дзяўчынка! Сама малая, а глядзела мяне, як родная. <...> Гэта ўжо не чужыя мне людзі, яны выратавалі мяне»* [5, с. 55–56].

Паказальна, што Шрэдэра вельмі хутка пакінула пачуццё найвышэйшага прасвятлення і радасці, і яго пачынае мучыць сумленне. Пісьменнік псіхалагічна абгрунтоўвае, чаму *«адзіны раз у жыцці»* ў немца *«ірванулася душа»* і ён здзейсніў «недаравальны» ўчынак, чаму Густава *«точыць чарвяк, што ён так ірвануўся душой»*. *«От бо нямецкая душа!* – разважае аўтар. – *Ніякіх там парываў, а ўсё павінна быць вылічана: колькі аршын радасці, колькі ўдзячнасці, колькі сяброўства і колькі дабра другому, каб не перадаць лішне. А можа ён яшчэ і з жывога гэтага Паліводскага здымаў, якое там к чорту знімаў! Здзіраў тое золата! Дык тады пісара пры ім не трэба было, каб запісваць, колькі немец скур з чалавека здзярэ. А вось калі душа яго на момант зварухнулася на справядлівую ўдзячнасць, дык ён адумаўся, што не паставіў пры душы таго пісара, які б падлічыў і запісаў, ці не залішне ён перадаў да чалавека ўдзячнасці, не гаворачы ўжо аб простым, бескарысным пачуцці»* [5, с. 56]. Гэтае разважанне пісьменнік укладвае ў вусны мясцовага фельчара, што ў маладосці *«служыў пры вялікім доктары»*, які браў яго з сабою ў Германію. *«О, я немцаў ведаю»*, – шматзначна даводзіць герой. Тым самым мастаком слова супрацьпастаўляюцца аксіялагічныя каштоўнасці ўспрымання свету сэрцам і розумам.

Шрэдэры, старэйшы і малодшы, апантаны прагай таго, ад чаго без вагання адмовіўся б Нявада, – прагай золата, з якім яны звязваюць усе свае думкі пра будучыню. Гэтыя людзі дзеля абагачэння гатовы на ўсё: на рабунак, марадзёрства. Жонка Шрэдэра Гертруда, жывучы ў маёнтку, падараваным ёй акупантамі, думае, што дасягнула шчасця, што сын – заваёўнік – і войска фюрэра забяспечаць ёй багатае жыццё. Яе ніколькі не мучаць сумленне і думкі, што адабранае, нарабаванае ў іншых шчасця не прынясе, што за ўсё трэба будзе плаціць. Расплата чакала немцаў на гэтай зямлі: жанчына памірае, а муж нават не лічыць патрэбным пахаваць яе. Не вярнуў назад золата Шрэдэр-старэйшы, што двойчы прыходзіў на нашу зямлю: у першую імперыялістычную вайну – заваёўнік, у другую – пад аховай заваёўнікаў. Ён загінуў ад кулі Кастуся Лукашэвіча, так і не паспеўшы разабрацца ні ў сабе, ні ў тым, ці прынесла яго золата шчасце і карысць каму-небудзь іншаму.

Кузьма Чорны раскрыў у рамане праблему неўміручасці існага ў жыцці. Сімвалам гэтай неўміручасці стала вялікае дрэва на скрыжаванні дарог. Жыццё не скончана, даводзіць пісьменнік, пакуль жывуць сумленныя, справядлівыя людзі. Дзякуючы ім на вялікім скрыжаванні дабра і зла Густаву першы раз удалося ўратаваць сваё жыццё, але беларусы не даруюць нахабства, таму ён і быў забіты, калі зноў прыйшоў на Беларусь.

Графа Паліводскага ў Першую сусветную, абрабаванага і ледзь жывога, выхадзіў Ракуцька. Амаль год карміў, даў прытулак, але калі той паправіўся, Сымон параіў былому графу прывучацца *«да якой-небудзь работы. Бяры дзе тут кавалак зямлі і жыві шчасліва»* [5, с. 70]. Паліводскага, які *«рабіць нічога не ўмеў, змалку і да гэтага*

*часу мог толькі гатовае праядаць"*, такая прапанова абурыла, ён абазваў свайго збавіцеля хамам, страляў у яго. З пачуццём уласнай годнасці Ракуцька прамаўляў да крыўдзіцеля: *«– Я цябе выратаваў, я даў табе жыццё. <...> Не за золата і маёнткі, якія ты мне абяцаў, а ад таго, што я мог зрабіць табе дабро. Я думаў, што ты ў душы будзеш удзячны мне, ажно ж ты горнешся да таго, каб мець толькі маёнткі, а не душу. Ты мяне называеш хамам? За тое, што я зрабіў табе – я чалавек, а за тое, як ты са мной абышоўся – ты хам»* [5, с. 70]. Сымон выгнаў Паліводскага з хаты, ён больш не збіраўся працаваць на дармаеда. А той спадзяваўся, што вайна адкрые дзверы ў будучыню, але памыліўся: вайна закрыла яму дзверы ў жыццё. Граф загінуў у тым краі, дзе збіраўся панаваць.

Чорны-гуманіст пераконвае, што не ў багацці шчасце, і беднае жыццё можа быць прыгожым, што няма нічога прыгажэй за сумленнага чалавека-працаўніка. Невыпадкова многія даследчыкі звярнулі ўвагу пры аналізе рамана «Пошукі будучыні» менавіта на гэтую асаблівасць твора. А. Адамовіч заўважыў, што Кузьма Чорны змог апаэтызаваць само званне чалавека. «Чалавек – вось што ён такое! – як бы гаворыць сваімі раманамі ваеннага часу Кузьма Чорны, малюючы выдатную галерэю людзей з народа <…> Людзі, якіх асабліва памятае, любіць Кузьма Чорны і праз якіх ён бачыць і ацэньвае чалавека, − гэта простыя і шчырыя людзі працы: аб іх Чорны пісаў усё жыццё, іх адкрыта паэтызуе ў рамане «Пошукі будучыні» [1, с. 182]. «Чалавек – цэлы свет», – любіў паўтараць Кузьма Чорны, і ён больш за ўсё ненавідзеў таго «жалезнага звера», што мільёнамі гасіць гэтыя «чалавечыя сусветы», непаўторныя і бясцэнныя» [1, с. 194].

Але ніхто з даследчыкаў чамусьці не звярнуў увагу на паэтызацыю Кузьмой Чорным кахання як найважнейшага паказчыку шчасця чалавечага, як аднаго са складнікаў нацыянальнай канцэпцыі быцця. У літаратуры няшмат твораў, дзе б з такой мастацкай сілай было засведчана, як двое людзей, што сышліся спачатку толькі з-за спагады адно да другога, сышліся, каб выжыць у гэтым бязлітасным свеце, змаглі спазнаць сапраўднае каханне. Старонкі, прысвечаныя нараджэнню гэтага пачуцця, самыя светлыя і лірычныя ў рамане. І што закаханым багацце, што ім тое золата, якое яны трымаюць у шуфлядцы стала, як нейкую дробязную рэч, калі багацце і золата ў іх душах! У абмалёўцы вобразаў Кастуся і Волечкі і апісанні нараджэння іх кахання Чорны-псіхолаг па-майстэрску карыстаецца дэталлю, запаволенымі бытавымі замалёўкамі, быццам вучыць і нас бачыць узвышанае ў зямным. Каханне і ёсць тое золата, якое адно і варта Чалавека, якім узнагароджвае лёс за духоўнае багацце, цярпенне... У гэтым бачыцца духоўна-эстэтычны патэнцыял рамана «Пошукі будучыні».

Галерэю лепшых прадстаўнікоў нацыі папаўняюць героі аповесці «Скіп'ёўскі лес», дзе аўтар канцэнтруе ўвагу на тым, якое выключнае значэнне ў жыцці чалавека, яго выхаванні, сталенні, выпрацоўцы светапогляду мае сям'я. Як нацыянальную рысу мастак паказаў замілаванасць беларусаў да сваіх дзяцей, жаданне і здольнасць апекавацца імі нават тады, калі ў дзяцей ужо дарослыя свае дзеці, інакш кажучы, – да канца жыцця. І з другога боку, гэта гатоўнасць дзяцей браць на сябе адказнасць за пастарэлых бацькоў.

У творы прадстаўлены народны погляд на шлюб, засяроджваецца ўвага на тых якасцях, якімі павінны валодаць людзі, што рыхтуюцца стварыць сям'ю. Сабастыян Рамашка, прыехаўшы да бацькоў будучай нявесткі прадстаўляе свайго сына: *«Тодзік хлопец залаты. Працавітасці, здатнасці, развагі і сталасці ў яго хапае, каб жыць, як чалавек»* [6, с. 300]. Хапіла ў хлопца розуму паказаць сваю абранніцу бацькам, жыццёвы вопыт якіх падказаў, што найлепш будучую гаспадыню можна праверыць ля печы. Выдатна здала дачка Прыбыткоўскіх гэты жыццёвы экзамен. Задаволены Сабастыян нахвальвае яе бацькам удалы выбар свайго сына: *«Ганна стала з старою каля печы і люба-*

*міла было глядзець, як яна ўпраўлялася. Залатыя рукі! Хто ж цябе, кажу, і выгадаваў такую? Напяклося ўсяго, насмажылася, наварылася...»* [6, с. 301].

Радасцю і шчасцем поўніцца маці Ганны, калі ўпершыню бачыць зяця з сынам на руках: *«Можна было падумаць, што век меў ён гэтае сваё дзіця і так заўсёды насіў яго, спакойна і з роўным настроем. Сіла простай натуры ідзе ад прыроджанага ўмельства быць у спакойнай раўнавазе з першай жа хвіліны, як толькі праходзіць час маладога свавольства і пачынаецца патрэба быць сталым. Тут вялікую сілу мае ясны розум і развага простага чалавека. Што ж да парываў маладой душы, то яны вечна знойдуць сабе вялікі прастор у шчаслівым зліцці гэтага чалавека з навакольным светам. У наймаладзейшыя свае гады ён будзе думаць аб сталасці жыцця, а не аб своеасаблівых прынадах легкадумнай уцехі. Працавітасць яго пачынаецца з маленства. Магдалена Прыбыткоўская чулай сваёй душой зразумела да канца ўсе гэтыя рысы ў натуры Тадзіка Рамашкі»* [6, с. 315].

Як добра трэба было пісьменніку ведаць і разумець душу беларуса, каб вось так проста і так глыбока выявіць духоўна-аксіялагічныя прыярытэты нацыі, у сваіх героях увасобіць лепшыя рысы нацыянальнага характару. Разгледжаныя намі творы Кузьмы Чорнага пацвярджаюць, што з аднаго боку, нацыянальны характар закладваецца генетычна, перадаецца з пакалення ў пакаленне. З другога боку, гэта сапраўды «феномен, абумоўлены сацыяльна-гістарычнымі і культурнымі ўмовамі развіцця нацыі», бо прымусовая калектывізацыя 30-х гадоў, міграцыя вяскоўцаў у гарады падчас індустрыялізацыі ў 60-я, іншыя тэхнагенныя праблемы XX стагоддзя, якія парушылі экалогію прыроды і экалогію душы, унеслі істотныя карэктывы ў нацыянальны характар беларусаў, увасоблены ў лепшых творах айчынных пісьменнікаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Адамовіч, А. Маштабнасць прозы: Урокі творчасці Кузьмы Чорнага / А. Адамовіч ; рэд. Н. С. Перкін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 200 с.
2. Мішчанчук, М. Кузьма Чорны. З верай у светлы дзень / М. Мішчанчук // Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мінск, 2001. – С. 91–150.
3. Национальный характер // Большой энциклопедический словарь : философия, социология, религия, эзотеризм, политэкономия / Главн. научн. ред. и сост. С. Ю. Солодовников. – Минск : МФЦП, 2002. – С. 538–539.
4. Тычына, М. Кузьма Чорны / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі ; Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2002. – Т. 2.– С. 330–369.
5. Чорны, К. Пошукі будучыні / К. Чорны // Выбраныя творы / К. Чорны ; уклад. і прадм. М. Тычына ; камент. М. Тычына, Я. Янушкевіч. – Мінск, 2000. – С. 27–178.
6. Чорны, К. Скіп'ёўскі лес / К. Чорны // Бацькаўшчына : раман, аповесці / К. Чорны ; прадм. М. А. Тычыны ; маст. А. А. Карповіч. – Мінск, 1989. – С. 292–348.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 10.09.2015

***Kavaliuk A.S.*** **The Spiritual and Axiological Space of a National Character in K. Chorny's War Prose**

*The article comprehends the artistic personification of national Belarusian character in K. Chorny's war prose, analyses the inner world of the characters, the examples of the author's ideal and nonideal.*